**НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ**




# ВЕРШАВАНЫ ДЗЁННІК

**Выйшла з друку новая кніга Алы Клемянок. Свой чарговы зборнік лірыкі беларуская паэтэса са Смаргоні назвала «Нальшчанскі блог» (Маладзечна, друкарня «Перамога», 2023).**

Новая кніга паэзіі Алы Клемянок «Нальшчанскі блог» – своеасаблівы вершаваны дзённік падзей апошніх пяці гадоў. Старажытная летапісная Нальшча – сённяшняя правінцыя. Дзе нашчадкі колішняга княства? Якім багам яны служаць? Аўтарка імкнецца спасцігнуць матывацыі жыццёвага выбару і духоўныя арыенціры сучаснікаў на складаным адрэзку часу.

*Анатацыя*

***

У новым зборніку вершаў Алы Клемянок 164 старонкі. У афармленні вокладкі кнігі выкарыстана карціна Аляксандра Грышкевіча «Доўгая зіма». Пераплёт цвёрды. Наклад 100 асобнікаў. У аўтарскай рэдакцыі. Выдавецтва і паліграфічнае афармленне: адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня «Перамога»».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

# «З тым скібу падзялю...»

**Ала Клемянок жыве ў Смаргоні. Яна журналіст са шматгадовым стажам, а яшчэ — паэтэса, якая выдала некалькі зборнікаў вершаў. І вось я трымаю ў руках чарговую кнігу «Нальшчанскі блог». «Пэўна, яна найбольш выпакутаваная, выпеставаная, — кажа аўтар. — Як доўгачаканае дзіця».**

У анатацыі гаворыцца, што «Нальшчанскі блог» — гэта своеасаблівы вершаваны дзённік апошніх пяці гадоў. «Дзе нашчадкі колішняга княства? — задаецца пытаннем аўтар. — Якім багам яны служаць?» І адначасова імкнецца спасцігнуць жыццё сучаснікаў, іх духоўныя арыенціры. Але кніга ахоплівае значна больш перыяд жыцця аўтара: ад юнай бестурботнай дзяўчыны,

прасякнутай марамі аб цікавых сустрэчах і падарожжах, да клапатлівай, руплівай маці, якая выхавала чатырох сыноў. Тут — жыццё чалавека з цвёрдымі перакананнямі, адданага ўсёй душой і сэрцам родным мясцінам, вернага да скону святым крыжам, мове бацькоў. І заўсёды радага надзейным сябрам, аднадумцам, блізкім найперш не па крыві, а па духу:

Паэзія — мой стан.
Чый стан па амплітудзе
раптоўна супадзе
з гайданнем дум маіх,
з тым скібу падзялю і пірагі на блюдзе,
і радасць, і тугу, і свята светлы міг.

У кнізе змешчаны вершы, прысвечаныя Смаргоншчыне, іншым цудоўным беларускім мясцінам са слаўнай гісторыяй, роднай мове, нямала філасофскіх разважанняў. І, канечне, ёсць вершы пра каханне, якое, калі яно сапраўднае, ніколі не бывае простым:

То ён салодкі,
то нібы палын
мой лёс, якому я, збальша, удзячная
за ўсе імправізацыі яго.
І за каханне,
што так неабачліва
назвала вечным.
Толькі і ўсяго...

Завяршаецца «Нальшчанскі блог» нізкай пародый на беларускіх творцаў. І гэты гумар, няхай часам і з'едлівы, з'яўляецца ўдалым дапаўненнем да агульнага зместу кнігі. Не стаўлю мэтай яе пераказваць, тым больш аналізаваць творы. Кожны, хто прачытае вершы Алы Клемянок, убачыць там нешта сваё.

**Аляксандр БЫКАЎ**

«Літаратура і мастацтва» № 44, 3 лістапада 2023 , старонка 7



Ала Клемянок. Пра аўтара (блог Алы Клемянок).